ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987
17
снежня
чацвер
№ 35(1556)

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

Беларускі ўніверсітэт
## ТЭЛЕТАЙП
*УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### САВЕТ МАЛАДЫХ ВУЧОНЫХ

філалагічнага факультэта арганізаваў чарговую канферэнцыю «Актуальныя праблемы філалогіі», у якой прынялі ўдзел маладыя вучоныя БДУ імя У. І. Леніна, АН БССР, МДПІЗМ, а таксама госці з Варонежа, Калініна, Ерэвана, Гомеля, Гродна. У рабоце канферэнцыі ўдзельнічалі таксама вядучыя спецыялісты філалагічнага факультэта, што надало абмеркаванню дакладаў больш глыбокі характар.

Пленарнае пасяджэнне адкрыў намеснік дэкана факультэта дацэнт У. М. Лазоўскі. З дакладам «70 гадоў савецкага мовазнаўства» выступіў прафесар А. Я. Супрун.

На канферэнцыі працавалі 4 секцыі: лексічнай семантыкі, псіхалінгвістыкі і сацыялінгвістыкі; граматыкі; лінгвістыкі тэксту і паэтыкі; літаратуразнаўства. Тэматыка дакладаў адлюстроўвала шырокі спектр сучасных праблем лінгвістыкі і літаратуразнаўства, іх прыкладныя і тэарэтычныя аспекты.

Вопыт правядзення канферэнцый маладых вучоных на філалагічным факультэце паказвае, што яны не толькі з'яўляюцца аглядам маладых творчых сіл, але і даюць магчымасць прадстаўнікам іншых рэспублік пазнаёміцца з напрамкамі і ўзроўнем філалагічных даследаванняў у Беларускім універсітэце, а таксама садзейнічаюць узнікненню навуковых кантактаў.

А. КІКЛЕВІЧ,
кандыдат філалагічных навук.





### КАЛІ ВЫ ЛЮБІЦЕ ДЗЯЦЕЙ

і маеце вопыт зносін з імі, маладзёжны кааператыў прапануе вам работу па ўходу за дзецьмі 3-14-гадовага ўзросту і метадычнай дапамозе малодшым школьнікам. За даведкамі звяртайцеся ў Савецкі райком ЛКСМБ.

Д. ВІЛЬКІН.

МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ

## Самая масавая маладзёжная

**Хрыста НІКАЛАУ вучыцца на IV курсе аддзялення міжнароднай журналістыкі. Цікавяць яе не толькі спецыяльныя і агульнаадукацыйныя дысцыпліны. «Моладзь розных краін павінна ведаць як мага болей аб сваіх сябрах»,— не без падставы лічыць Хрыста і прапануе чытачам невялікі расказ аб Адзінай Дэмакратычнай Арганізацыі Моладзі (АДАМ), што была створана на Кіпры 12 красавіка 1959 года.**

КІПРСКІ народ і моладзь краіны атрымалі ў спадчыну ад каланізатараў шмат эканамічных і сацыяльных праблем. Працоўныя масы пакутавалі ад беднасці і беспрацоўя. Эміграцыя ператварылася ў сацыяльнае бедства. Адукацыя ўсё яшчэ заставалася прывілеяй меншай часткі моладзі.

У гэтых умовах масы дэмакратычнай моладзі былі гатовы працягваць барацьбу супраць імперыялізму, за ліквідацыю замежных ваенных баз, за поўную незалежнасць Кіпра.

Члены арганізацыі ў лекцыях, дакладах, на занятках у школах, у навуковых працах і публікацыях газеты «Моладзь» расказваюць маладому пакаленню аб гісторыі працоўнага руху ў краіне за звяржэнне каланізатарскага прыгнёту, за сацыяльны прагрэс і сацыялізм.

Перадавая моладзь дапамагае тысячам юнакоў і дзяўчат даведацца аб эксплуататарскім характары імперыялізму. Мэта ідэалагічна-адукацыйнай работы АДАМ — выхаванне моладзі ў духу барацьбы супраць правага і левага экстрэмізму, антыкамунізму і антысаветызму.

З 1959 года арганізацыя звязваецца з міжнародным прагрэсіўным рухам моладзі, якая вядзе барацьбу супраць каланіялізму і неакаланіялізму. Яна ўносіць вялікі ўклад у развіццё народнай культуры, стварыла дзесяткі танцавальных і музычных груп, аматарскіх тэатраў.

АДАМ пашырае духоўны свет моладзі, абараняе яе ад уздзеяння заходняга ладу жыцця. Хаця Адзіная Дэмакратычная Арганізацыя Моладзі і не з'яўляецца прафесійнай арганізацыяй, яна бярэцца за вырашэнне ўсіх праблем, з якімі сутыкаецца працоўная моладзь краіны. Сацыяльны клопат аб дзецях, працяглая дзейнасць за развіццё культурнага, адукацыйнага іх ўзроўню была і застаецца адной з галоўных задач АДАМ.

На фоне гісторыі гады існавання арганізацыі прагрэсіўнай моладзі Кіпра займаюць невялікі адрэзак часу. Але за гэтыя цяжкія гады выпрабаванняў АДАМ стала самай масавай маладзёжнай арганізацыяй Кіпра.

## Воін запасу!

ДАРАГІ брат і паплечнік па зброі!

Ты да канца выканаў свой святы салдацкі абавязак. Далёка ад дому ты навучыўся цаніць дружбу, сумленнасць, ты пазнаў цану жыцця і слова.

Зараз, калі ў краіне разгортваецца перабудова, калі рукі кожнага сумленнага чалавека куюць светлае будучае нашых дзяцей і ўнукаў, ты павінен заставацца на перадавой.

Памяццю тых, каму ўжо не суджана стаяць ля станка, вырошчваць хлеб і мыць дзяцей — звяртаюцца да цябе воіны-інтэрнацыяналісты Мінскага гарадскога клуба воінаў запасу «Памяць».

Брат!

Аддадзім свае сілы і веды без астатку справе выхавання патрыётаў і будучых воінаў. Клуб будзе рады прыняць цябе ў свае рады.

Наш адрас: г. Мінск, вуліца Кульман, 15, тэлефон 34-59-66.

Гатовых адгукнуцца на гэты зварот просьба сабрацца 24 снежня 1987 года ў 14.30 у аўдыторыі 206 галоўнага корпуса.

САВЕТ ГАРАДСКОГА КЛУБА ВОІНАЎ ЗАПАСУ «ПАМЯЦЬ».



УСІМ ВЯДОМА, што практычныя заняткі амаль заўсёды праводзяць выкладчыкі. Але ці правільна гэта? На кафедры фізіялогіі чалавека і жывёл біялагічнага факультэта палічылі, што больш мэтазгодна, каб рыхтавалі лабараторныя супрацоўнікі навукова-даследчай лабараторыі біяэнергетыкі. Па-першае, у студэнтаў у такім выпадку паяўляецца цікавасць да навукі, па-другое, самі маладыя вучоныя атрымліваюць навыкі работы са студэнтамі.

НА ЗДЫМКАХ: чарговы дослед праводзіць малодшы навуковы супрацоўнік навукова-даследчай лабараторыі біянергетыкі Леанід МАРОЗ. З цікавасцю сочаць за вопытам студэнты III курса Ігар СЯМАК і Юра РАБАЎ.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.



ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА. ШТО ЗРОБЛЕНА?

## УСЛЕД ЗА «БЕДАМІ З АБЕДАМ»

Матэрыял «Беды з абедам», надрукаваны ў газеце за 29 кастрычніка 1987 года, быў абмеркаваны ў трэсце сталовых Маскоўскага раёна, калектыве сталовай № 33 і на сумеснай нарадзе адміністрацыі трэста і адміністрацыі БДУ, на якой прысутнічалі і прадстаўнікі грамадскіх арганізацый універсітэта.

Сёння мы публікуем адказ, падрыхтаваны выконваючай абавязкі дырэктара трэста сталовых Маскоўскага раёна Людмілай Цімафееўнай БОНДАР.

«БОЛЬШАСЦЬ негатыўных фактаў, прыведзеных у артыкуле, сапраўды мелі месца ў рабоце філіялаў сталовай № 33.

За парушэнне санітарных правілаў тэхналогіі прыгатавання страў, неадпаведнасць асартыменту меню з загадчыкаў вытворчасці сталовых хімфака і інтэрната № 7 БДУ зняты каэфіцыенты якасці працы за лістапад у памерах 1,0 з кожнай, яны пазбаўлены прэміяльнай даплаты на 100 працэнтаў. Загадчык сталовай № 33 Ю. М. Свірыдчык і яго намеснік А. Б. Гарадзецкі за выяўленыя парушэнні ў наладжванні работы падведамасных прадпрыемстваў будуць пазбаўлены ўзнагароды па выніках працы за год у памерах 20 працэнтаў кожны.

Адной з прычын нездавальняючага санітарнага стану асобных прадпрыемстваў, нізкага працэнту ахопу студэнтаў гарачым харчаваннем (34,7) і нізкай забяспечанасці пасадачнымі месцамі (37 працэнтаў з'яўляецца іх нездавальняючы сантэхнічны стан.

Напрыклад, сталовыя хімічнага факультэта і галоўнага корпуса працуюць у прыстасаваных памяшканнях, якія не адпавядаюць патрабаванням санітарных нормаў і правілаў, нярэдка затапліваюцца каналізацыйнымі водамі, тэрмін эксплуатацыі ўсіх відаў абсталявання даўно мінуў (ліст камбіната «Белгандальтэхніка» ад 19.11.1987 года, № 07), патрабуецца капітальны рамонт.

У выніку правядзення сумеснай нарады работнікаў апарату трэста і БДУ 17 лістапада 1987 года намечана ажыццявіць шэраг сумесных мерапрыемстваў па паляпшэнню арганізацыі харчавання студэнтаў універсітэта:

— укамплектаваць сталовыя БДУ кадрамі, якіх зараз не хапае;

— правесці мастацка-афарміцельскія работы ў інтэр'ерах абедзенных залаў пунктаў грамадскага харчавання БДУ;

— зманціраваць у сталовай хімічнага факультэта камеру для захавання харчовых адходаў;

— выдзеліць памяшканне ў хімічным корпусе для захавання і выдачы малака для спецыяльнага харчавання;

— у 1988—89 годзе правесці ў сталовай хімічнага корпуса капітальны рамонт;

— забяспечыць сталовую галоўнага корпуса фарфоравым посудам і прыборамі з нержавеючай сталі (для залы выкладчыкаў);

— прафкому студэнтаў правесці апытанне з мэтай высвятлення неабходнасці арганізацыі дыетычнай сталовай на базе сталовай інтэрната № 7 і даць адказ у трэст да 1 снежня 1987 года;

— узгадніць з прафкомам студэнтаў асартыментны пералік кафэ «Гаўдэамус»;

— сумесна з прафкомам студэнтаў праводзіць раз у месяц спажывецкія канферэнцыі і прымаць канкрэтныя рашэнні па іх выніках;

— абсталяваць у сталовай інтэрната № 5 спецыялізаваную кропку — дэсерт-бар;

— па выкананню намечаных мерапрыемстваў правесці сумесную сустрэчу адміністрацыі трэста і БДУ у снежні 1987 года».

**АД РЭДАКЦЫІ.** Нам здаецца, пералік мерапрыемстваў, складзены на сумеснай нарадзе, дазваляе паверыць у тое, што з цягам часу студэнцкі абед будзе арганізаваны без бед і для адміністрацыі сталовай № 33 і яе філіялаў, і для наведвальнікаў. Пакуль жа будзем чакаць выступлення на старонках газеты Ю. М. Свірыдчыка аб «непапяровых» зменах. А такіх пакуль (хоць з дня апублікавання прайшло амаль 2 месяцы) не відаць. Тым болей, што паўстаюць новыя пытанні. Патрабуецца пашырэнне і рэканструкцыя буфета філалагічнага факультэта, які зараз з-за адсутнасці належных умоў рэалізуе толькі халодныя закускі. Па-ранейшаму адсутнічае кропка харчавання на геаграфічным факультэце. Такім чынам, у рубрыцы «Быт ці не быт?» газета плануе працягваць размову аб набалелым для студэнтаў пытанні харчавання. Чакаем выступленняў адказных за справу і тваіх водгукаў, чытач.

# З юбілеем!

— На кожную ролю трэба затрачваць розум, душу і з кожным разам страты папаўняць — рабіць ўсё як бы нанава. Манета заціраецца ад таго, што вельмі шмат людзей трымаюць яе ў руках, ігра ж акцёра не павінна горшаць ад паўтарэння: кожны раз трэба знаходзіць у сабе сілы іграць свежа, па-новаму.

Так лічыць рэжысёр народнага тэатра-студыі БДУ Барыс ВТОРАЎ. З ім, напэўна, будуць згодны ўсе ўдзельнікі тэатра, а іх нямала. Бо сёння студэнцкаму тэатру спаўняецца сорак гадоў. Віншуем юбіляраў і жадаем ім на пятым дзесятку сілы, згуртаванасці і пранесці любоў да тэатра праз усё жыццё.

А. ВІХРОВА.



НА ЗДЫМКУ: удзельнікі тэатра-студыі са сваім рэжысёрам Б. Вторавым (справа) напярэдадні юбілейнага канцэрта.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

# Ружовы ранак

Літаратурная старонка

Падведзены вынікі другога тура конкурсу на лепшы верш. На гэты раз пераможцамі сталі Андрэй Гуцаў (за верш «Соннасць») і Гі Арман Нсатунказі (за вершы «К рукам...» і «Мама, родная...»).

Шчыра віншуем лаўрэатаў і прапаноўваем некалькі новых вершаў, якія былі дасланы на конкурс.

Акрамя таго, як і абяцалі, сёння мы змяшчаем некаторыя водгукі, у якіх чытачы газеты разважаюць пра творы ўдзельнікаў конкурсу.

Алесь БАДАК

## Думкі Думкі...

ВЕРШЫ Вольгі Норынай кранаюць сваёй шчырасцю. Яны лёгкія і ў той жа час вельмі пранікнёныя і, напэўна, блізкія многім чытачам.

Ірына ВЕЦІОРАЦ

ВЕРШЫ Вольгі Норынай вельмі вобразныя. У іх добра перадаецца пачуццё.

Марына ГЕРКО,
Алена БУЙНІЧ.

ВЕРШЫ «Вернись...» і «Было...» шчырыя, але напісаны не зусім прафесійна, падобнае пішуць усе школьнікі. Таму ў гэтым сэнсе хацелася б вылучыць хоку Міраслава Шайбака, асабліва яго «Шклянку ля крыжа...».

Ларыса ШАЙДО.

ВЕЛЬМІ цяжка ўкласці думку, вобраз у кароценькі, з трох радкоў верш. Міраславу Шайбаку гэта ўдаецца. З ягонай падборкі хочацца вылучыць хоку «Шклянка ля крыжа...».

Галіна КАЧАТКОВА.

ЧАСТА чытаеш вершы маладых і ловіш сябе на думцы, што нешта падобнае ўжо недзе было, прычым лепш і цікавей. Таму мне падабаюцца спробы Андрэя Гуцава і Міраслава Шайбака знайсці нешта сваё, не падобнае на творчасць іншых: у тэме, у вобразе.

Мікола ЗЯЛЯНОЎСКІ.

Ігар ВОЙНІЧ

## Хоку

* * *

Адшукай мне ліст,
Дзе апошні аўтограф
Пакінуў вецер.

* * *

Сведка сяброўства,
Колькі табе гадоў
У асенні вечар?

Славамір АДАМОВІЧ

• • •

Паперадзе бязлюднай
электрычкі
Кульгавы змрок ляціць
у нікуды,
І падаюць спалоханыя
знічкі
ў рачныя ціхаплынныя
брады.
Саспела перуноў святая
помста,
і ўжо з адхонаў сыплецца
жарства,
і гарадоў асфальтавыя
монстры
зямлю распяць гатовы,
як Хрыста.
Схаваліся ад непагадзі
душы
пад абарог адзін на цэлы свет.
А свет злажыў хатуль і
сцежкай рушыў,
смакуючы сяголетні ранет.
Ягоны шлях кіруе ў суквецці
галактык чыстых, дзе няма
хлусні
і дзе на кожнай роснае
планеце
травой жывуць шакалы і ласі.





Галіна РАКОЦА

*Н. Б. КУЧМЕЛЬ*

З дня ў дзень,
З дня ў дзень
Бязважкай халоднай хваткай
Палоняць мяне
Знаёмыя рэчы,
Знаёмыя вочы,
Урэшце — проста знаёмыя.
Вецер забівае дых калючым
паветрам.
Пажваканая лістота туліцца
да ног,
Блытаючы таропкасць
крокаў.
Малочныя ліхтары навязліва
зыркаюць услед.
Сябры, сустракаючы ў вулках,
Торгаюць крысо апранахі:
— У мяне да цябе тэрміновая
справа...

З дня ў дзень,
З дня ў дзень
Вечны круг:
Аднастайнасці,
Адназначнасці,
Адна...
Пачынаю бегчы,
Спрабуючы вырвацца з круга.
Ёсць жа за ім Сапраўднае
Жыццё,
Дзе жыць трэба Сапраўдна...
Як прыкра рэжа слых
Шоргат лістоты,
Шэпт ветру і ліхтароў,
Крык маіх сяброў.
Урэшце,
Што яны пра мяне ведаюць?
Што?

Міхась СКОБЛА

## Роднаму берагу

Ростані між намі неаднойчы
Снежань замятаў і лістапад,
І даводзіў голас мне
прарочы:
— Болей ты не вернешся
назад.

Ад забытых адрачыся ісцін.
Не стыдайся, век цяпер
такі...
Абяцалі правільнае выйсце,
Беручы з сабою, цягнікі.

Пра прагрэс крычалі
транспаранты...
Толькі заставалася адно —
Не ляжыць душа
да эсперанта,
І канца дарогам не відно.

Ад таго адвечнага, былога
Праз расстанні, горыч і шляхі
Да свайго, да вечнага парога
Мы паклон прыносім і грахі.

Пад паветкай ціхай,
апусцелай
Згорбілася бацькава вясло.
Колькі б сэрца волі
ні хацела —
Човен мой да берага нясло.

І вязём мы з кожнай
адысеі
Мудрых слоў і славы
дзівасіл.
А каб поле бацькава дасеяць,
Не стае ні вопыту, ні сіл.

## Даліна болю

*Яшчэ радзіма ў ім жыве*
*Святлом бяроз,*
*Вачмі матулі...*
*Не ўратаваў бронежылет*
*Ад той ліхой душманскай*
*кулі.*
*Набрак трывожнай цішай*
*змрок.*
*Сябры не чулі стрэл*
*злачынны.*
*І быў яго апошні крок*
*Накіраваны ў бок Айчыны.*
*У гор спагады не пытай,*
*Што прытаіліся варожа.*
*І на зямлі чужой шпіталь*
*Уваскрасіць ужо не зможа.*
*Матуля ў роднай старане*
*Чакала сына, як нікога,*
*А сына ў цынкавай труне*
*Сустрэць прыйшлося ля*
*парога.*
*Вяршыні велічнай красы,*
*Зямля арыкаў і камення,*
*Перад матулямі Русі*
*Вы стаць павінны на калені!*
*Замоўкне ў вас апошні бой,*
*Ды доўга потым біцца будзе*
*Славянскі боль,*
*Славянскі боль*
*Аб гор сівых нямыя грудзі.*



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвона» зорка» МВПА імя Я. Коласа.
7 снежня 1987 г.
Зак. 1599.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
З. А. АЛЯШКЕВІЧ.